# ПЯЦЬ ПАВЕРХАЎ... АДАМОВІЧА

## Выява на фасадзе

Стварэннем яе займалася мінская студыя мастацкага роспісу «Zadelo».

— Да нас звярнулася начальнік аддзела ЖКГ і будаўніцтва Капыльскага райвыканкама Марына Канончык і прапанавала супрацоўніцтва, — расказаў кіраўнік студыі Яўген Салановіч. — Дагэтуль мы размалявалі шмат фасадаў да «Дажынак» у Скідзелі. У Капылі нам зацвердзілі два партрэты — Адама Русака і Алеся Адамовіча. Перадалі карцінкі, і мы зрабілі некалькі стылізаваных варыянтаў, каб твары «ажылі».

Алеся Адамовіча малявалі непасрэдна сам Яўген і яго цёзка па прозвішчы Мацюта. Кіраўнік студыі лічыць, што асаблівых цяжкасцяў у іх рабоце няма — наадварот, спрэс адна творчасць. Робіцца праект і візуальная карцінка, якая потым накладваецца на фасад дома ноччу з дапамогай спецыяльнага праектара і абводзіцца. А ўжо днём мастакі яе размалёўваюць. На стварэнне двух муралаў майстрам спатрэбіліся чатыры дні. Праўда, з Адамовічам крыху прыйшлося паваждацца. Але гэта толькі таму, што якраз у тыя два дні, калі яго малявалі, стаяла нясцерпная спёка — за 30 градусаў, фасад награваўся, як патэльня.

Яўген расказвае пра асаблівасці работы стрымана, для яго гэта звыклая справа. І тое, што прыходзіцца працаваць на вышыні, ад адной думкі пра якую ў некаторых уразлівых заходзіцца сэрца, для яго ўсяго толькі рабочыя моманты. Каб зрабіць выяву, лічы, 15-метровай вышыні, спатрэбілася нават прыгнаць спецтэхніку з Мінска. У Капылі не знайшлося ножнічнага пад'ёмніка, які б змог падняць майстроў на пяты паверх. Пошукамі займалася сама фірма, бо ўсе пытанні, звязаныя з арганізацыяй работ, яна вырашае самастойна — як той казаў, працуе пад ключ. А прыстасаванне дазволіла майстрам тварыць у чатыры рукі і ўкласціся ў мінімальныя тэрміны.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)




Прыпынак Глушы, дзе прайшло дзяцінства пісьменніка.

Партрэт Адамовіча зроблены ў сіне-шэрых тонах.

— Мы выкарыстоўвалі спецыяльную акрылавую фарбу, якая будзе трымацца на фасадзе даволі доўга, — заўважае Яўген. — Якасць заўсёды залежыць ад тых рук, якія робяць работу, і фарбы. Некаторыя з іх, на жаль, хутка выгараюць. Мы ж за сваю работу адказваем.

На рахунку кампаніі шмат муралаў, прычым знакавых. Памятаеце чорна-белы арнамент на фасадзе кавярні «ДЭПО» на вуліцы Зыбіцкай у Мінску? Гэта справа рук супрацоўнікаў студыі. З найбольш уражальных сталічных аб'ектаў можна назваць яшчэ Маскоўскі дворык. На Магілёўшчыне ў Клімавічах не менш цікавы арт-аб'ект — незвычайна рэалістычны разлом сцяны з карцінкай знутры на старадаўняй вежы лікёра-гарэлачнага завода. А вось партрэт Адамовіча ў іх рабоце быў упершыню.

— Людзі па-рознаму адносяцца да нашай творчасці, — кажа Яўген. — Заўсёды знойдзецца нейкі песіміст, якому нешта не падабаецца. Але асабіста для мяне вельмі прыемна, што мурал з партрэтам Адамовіча мы зрабілі ў такі сімвалічны для яго біяграфіі год.

## Алея пісьменнікаў

На Капыльшчыне нарадзілася шмат таленавітых людзей, у тым ліку пісьменнікаў і паэтаў. Да Дня пісьменства ў горадзе з'явіцца прысвечаная ім алея з інтэрактыўнымі лавачкамі, у тым ліку і ў гонар Алеся Адамовіча. З дапамогай QR-кода, які будзе на іх нанесены, любы жадаючы зможа даведацца пра творчае жыццё пэўнага аўтара і яго літаратурную спадчыну. Так, Алесь Адамовіч нарадзіўся ў вёсцы Канюхі, дзе ў тамтэйшым Доме адпачынку падпрацоўваў падчас сваёй вучобы на медыцынскім факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта яго бацька — Міхаіл Іосіфавіч. Пасля заканчэння ВНУ дыпламаваны ўрач разам з сям'ёй пераехаў па размеркаванні ў пасёлак Глуша Бабруйскага раёна Магілёўскай вобласці. Там і прайшло дзяцінства будучага пісьменніка.

— Муралы і Алея пісьменнікаў — гэта ідэі нашых аддзелаў ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі, а таксама — ЖКГ і будаўніцтва, — паведаміў **намеснік старшыні Капыльскага райвыканкама Аляксандр ДУБІНА.** — Вельмі важна папулярызаваць сваіх знакамітых ураджэнцаў. Хто не ведаў, даведаецца, хто ведаў — будзе ганарыцца. А для падрастаючага пакалення гэта стымул для таго, каб развівацца і дасягаць вышынь у розных сферах дзейнасці.

— Алесь Адамовіч — славуты пісьменнік, мы ім вельмі ганарымся, — адзначыла **начальнік аддзела ЖКГ і будаўніцтва Марына КАНОНЧЫК.** — Мы паклапаціліся, каб яго і яшчэ некалькіх нашых літаратурных творцаў ушанаваць на фасадах дамоў. Іх партрэты вырашана размясціць на будынках адной з цэнтральных вуліц горада, дзе праходзяць усе нашы раённыя мерапрыемствы. Гэта найлепшы спосаб папулярызаваць знакамітых асоб.

## А ў Канюхах — прыпынак Адамовіча

Цяпер пра славутага беларускага пісьменніка на Капыльшчыне нагадваюць два арт-аб'екты — мурал на пяціпавярховіку ў самім Капылі і прыпынак грамадскага транспарту ў Канюхах. Прыпынак з'явіўся дзякуючы неабыякавым жыхарам вёскі — **Таццяне** і **Віктару КОРЗУНАМ.** Іх вельмі ўразіў «Адамовічаўскі» прыпынак у Глушы. Прыязджалі яны туды ў 2019 годзе на адкрыццё помніка Адамовічу. А праз год запрасілі на адкрыццё арт-прыпынку з партрэтам пісьменніка ў Канюхах. У нумары «Звязды» ад 26.08.2020 пра гэта ёсць артыкул. Таццяна лічыць: вёсцы вельмі пашчасціла, што Адамовіч нарадзіўся менавіта тут. Цяпер яна працуе над кнігай, дзе апіша гэты перыяд у дэталях.

— Наша вёска звычайная, але з цікавай гісторыяй, — інтрыгуе суразмоўніца. — Тут у XVI стагоддзі знаходзілася панская сядзіба — шыкоўны дом з белымі калонамі, у якім у 1921-м быў створаны Дом адпачынку. Тут адпачывалі і лячыліся ў асноўным удзельнікі Грамадзянскай вайны. Менавіта тут і нарадзіўся ў 1926 годзе Алесь Адамовіч. А ў 1927-м — Дом адпачынку быў пераведзены ў Віцебскую вобласць. У аўтабіяграфічнай аповесці «Пражыта» Алесь Міхайлавіч піша, што самае таямнічае месца ў яго біяграфіі — менавіта Канюхі. «Я нічога са свайго канюхоўскага жыцця не памятаю», — прызнаецца ён, і гэта зразумела. Бо бацькі звезлі яго з вёскі гадавалага. На месцы былой панскай сядзібы ў Канюхах



...і ў Канюхах, дзе ён нарадзіўся.

была пабудаваная Грозаўская школа-інтэрнат. У сярэдзіне 1970-х пісьменнік прыязджаў сюды на сустрэчу з яе навучэнцамі і настаўнікамі.

Корзуны запэўніваюць, што іх арт-прыпынак у Канюхах карыстаецца нязменным попытам. На яго фоне фатаграфуюцца і мясцовая дзятва, і выпадковыя падарожнікі, якія праязджаюць міма на сваіх аўто. Яны чытаюць нанесеную на сцяну прыпынку цытату з кнігі «Пражыта» і разумеюць, што Канюхі — не проста пункт на карце.

Падобныя аб'екты надаюць значнасць мясцовасці, прываблівають да яе турыстаў. Вось і ў Бабруйскім раёне спадзяюцца, што музей Адамовіча ў Глушы ўсё ж такі будзе створаны. Пры аддзеле ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі адкрыты разліковы рахунак, на які збіраюцца ахвяраванні на рэканструкцыю былой аптэкі ў Глушы пад яго. Дом знакаміты тым, што быў цэнтрам партызанскага падполля падчас вайны. У ім і адбываліся ўсе тыя гераічныя падзеі з удзелам тутэйшых жыхароў, апісаныя Алесем Адамовічам у дылогіі «Партызаны».

*«У Рэспубліцы Беларусь шырока вядомае імя пісьменніка, сцэнарыста, літаратуразнаўца, грамадскага дзеяча — Алеся Адамовіча. Нашай Бабруйскай зямлі пашчасціла мець непасрэднае дачыненне да імя і творчай спадчыны гэтага выдатнага чалавека. Дзякуючы творчасці пісьменніка, пасёлак Глуша стаў вядомы на ўвесь свет. Неўміручы стаў і подзвіг людзей, якія жылі ў пасёлку і змагаліся з акупантамі. Яны сталі прататыпамі герояў раманаў «Вайна пад стрэхамі» і «Сыны ідуць у бой»,* — гаворыцца ў звароце на сайце Бабруйскага райвыканкама. Банер з рэквізітамі рахунку можна знайсці з дапамогай стрэлак на стужцы ўнізе старонкі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з архіва Таццяны Корзун.**

---

Прыёмная кампанія — 2021

# ВНУ, КАЛЕДЖЫ, ЛІЦЭІ...

## Ва ўстановах адукацыі чакаюць сваіх абітурыентаў

**Вышэйшыя навучальныя ўстановы працягваюць размяшчаць інфармацыю пра дадатковы набор на бюджэтныя месцы, што засталіся вакантныя пасля залічэння прэтэндэнтаў на студэнцкі білет. Вызначыцца з выбарам прафесіі і месцам навучання можна да 7 жніўня ўключна.**

Так, дадатковы набор абвясцілі ў БНТУ, дзе на дзённай бюджэтнай форме навучання вакантных месцы засталіся на 18 спецыяльнасцях. Самая вялікая колькасць незапоўненых месцаў на спецыяльнасцях «Металургічная вытворчасць і металаапрацоўка» (27), «Машыны і тэхналогія ліцейнай вытворчасці» (22), «Машыны і тэхналогія апрацоўкі матэрыялаў ціскам» (20), «Водагаспадарчае будаўніцтва» (21), «Інавацыйная тэхніка для будаўнічага комплексу (кіраванне падраздзяленнямі інжынерных войскаў)» — 15.

На завочнай бюджэтнай форме навучання вакантных засталіся 10 месцаў на спецыяльнасці «Вытворчасць будаўнічых вырабаў і канструкцый». Для паступлення пры дадатковым наборы на завочную форму атрымання адукацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту абітурыенты павінны мець або профільную сярэднюю спецыяльную адукацыю, або прафесійна-тэхнічную адукацыю, або працаваць па сумежнай ці роднаснай спецыяльнасці (пацвярджаецца выпіскай з працоўнай кніжкі), а таксама тры сертыфікаты цэнтралізаванага тэсціравання па прадметах уступных выпрабаванняў: беларуская або руская мова (мінімум 10), матэматыка (мінімум 20) і фізіка (мінімум 10).

У БДПУ на спецыяльнасці «Фізіка. Інфарматыка» на дзённай бюджэтнай форме навучання засталося 16 незапоўненых месцаў. Для паступлення патрабуюцца тры сертыфікаты ЦТ: па рускай ці беларускай мове — ад 10 балаў і больш, па фізіцы — ад 20 балаў і матэматыцы — ад 10 балаў.

У Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь вакантных 115 бюджэтных месцаў: на спецыяльнасці «Эксплуатацыя радыётэхнічных сістэм» — 34, «Кіраванне падраздзяленнямі ракетных войскаў і артылерыі» — 14, «Эксплуатацыя наземных сістэм узбраення, эксплуатацыя радыётэхнічных сістэм» — 12 і гэтак далей.

Прафесійны адбор для абітурыентаў дадатковага набору будзе праводзіцца на базе Ваеннай акадэміі да 7 жніўня. Залічэнне адбудзецца 8 жніўня.

Дадатковы набор на ваенны факультэт праходзіць і ў БДУІР па спецыяльнасцях «Радыётэхніка (спецыяльныя сістэмы радыёлакацыі і навігацыі)» у інтарэсах Міністэрства абароны — 14 месцаў і «Інфакамунікацыйныя сістэмы (стандартызацыя, сертыфікацыя і кантроль параметраў)» у інтарэсах Міністэрства абароны — 1 месца.

Тым часам у краіне працягваецца прыём дакументаў у сярэднія спецыяльныя і прафесійна-тэхнічныя навучальныя ўстановы. Прыём вядуць 110 устаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі (з іх 9 — прыватнай формы ўласнасці), а таксама 84 установы адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі. План прыёму для атрымання сярэдняй спецыяльнай адукацыі складае сёлета каля 39,6 тысячы чалавек. Прыёмная кампанія завершыцца 18 жніўня.

На ўзроўні прафесійна-тэхнічнай адукацыі прыём дакументаў пачаўся яшчэ 15 чэрвеня. Працэс ідзе актыўна, у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года назіраецца рост колькасці пададзеных ад абітурыентаў заяў. Прыём дакументаў завершыцца 20 жніўня. Абітурыентаў чакаюць 125 устаноў прафтэхадукацыі і 41 установа іншых узроўняў, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы прафтэхадукацыі па больш чым 250 прафесіях. Агульны лічбы прыёму на гэты год — каля 26,7 тысячы чалавек.

У Рэспубліканскім інстытуце прафесійнай адукацыі створаны YouTube-канал «Твая прафесійная адукацыя», на якім выпускнікі могуць азнаёміцца з найбольш запатрабаванымі спецыяльнасцямі. Уласнай формулай поспеху дзеляцца і майстры сваёй справы, якія скончылі каледжы і прафесійныя ліцэі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**